А. І. КОНАНАВА

# ТЭМА АБАРОНЫ І ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ Ў ДРУКУ ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЕЙ БЕЛАРУСІ

**(па матэрыялах «Вольнай працы» 1939—1941 гадоў)**

«Наш ідэал—свет без зброі і насілля, свет, у якім кожны народ свабодна выбірае шлях развіцця, свой спосаб жыцця. Гэта—выражэнне гуманізму камуністычнай ідэалогіі, яе маральных каштоўнасцей»[1]. Таму магістральным напрамкам знешнепалітычнай дзейнасці Камуністычнай партыі і савецкай дзяржавы была і застаецца барацьба за аслабленне пагрозы вайны, стрымліванне гонкі ўзбраенняў, захаванне міру. Адстаяць мір—зараз самая важная задача ў міжнародным плане для нашай партыі, нашага народа, для народаў усёй планеты. Умацаванне міру набывае асаблівую важнасць, а вырашэнне пастаўленых задач—асаблівую тэрміновасць.

Сусветны прагрэсіўны друк і, у першую чаргу, прэса Савецкага Саюза, пастаянна ўдзяляюць пільную ўвагу пытанням рэгулявання адносін паміж дзяржавамі мірнымі сродкамі. Аднак аб'ектыўныя абставіны не дазваляюць забываць і пра ўласную абараназдольнасць. На старонках савецкага шматнацыянальнага друку адлюстроўваецца работа партыйных, камсамольскіх, савецкіх, грамадскіх арганізацый па ваенна-патрыятычнаму і абаронна-масаваму выхаванню працоўных. Формы і метады дзейнасці перыядычнага друку ў гэтым напрамку разнастайныя, пастаянна ўдасканальваецца, павышаецца іх эфектыўнасць і дзейснасць. У развіцці сродкаў масавай інфармацыі, плённым росце творчай актыўнасці журналістаў пазітыўную ролю адыгрывае вывучэнне вопыту, пераемнасці і традыцый савецкай журналістыкі. Цікавы ў гэтым сэнсе вопыт партыйна-савецкага друку заходніх абласцей Беларусі ў перадваенныя гады.

Восенню 1939 года па рашэнню партыі часці Чырвонай Арміі перайшлі граніцу буржуазнай Польшчы і ў кароткі тэрмін занялі Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну. Гэтыя вобласці ўз'яднаціся з брацкімі рэспублікамі. 2 лістапада 1939 года быў зацверджаны закон аб прыняцці Заходняй Беларусі ў састаў БССР [2].

За кароткі тэрмін на вызваленай зямлі былі арганізаваны рэдакцыі абласных, раённых, гарадскіх газет—органаў камітэтаў КП(б)Б і Саветаў дэпутатаў працоўных. З 1940 года стала выходзіць газета «Штандар вольнасці» («Сцяг свабоды»)—орган ЦК КП(б)Б.

Накіроўваючы дзейнасць друку ў заходніх абласцях рэспублікі, бюро ЦК КП(б) Беларусі неаднаразова падкрэслівала неабходнасць павышэння яго ролі ў патрыятычным выхаванні працоўных. У пастанове «Аб рабоце рэдакцыі газеты «Звязда» (1939) гаварылася, што на старонках газет неабходна асаблівую ўвагу ўдзяляць пытанням умацавання абароны краіны, паказваць работу ваенных аддзелаў, работу пярвічных арганізацый Асавіяхіма, партыйнае кіраўніцтва абароннымі таварыствамі, развіваючы і культывуючы савецкі патрыятызм. Напярэдадні вайны, 10 чэрвеня 1941 года, бюро ЦК КП(б)Б прыняло рашэнне аб выданні новага грамадска-палітычнага маладзёжнага часопіса «Молодой патриот»[3].

Ужо к сярэдзіне 1940 года на тэрыторыі заходніх абласцей Беларусі была створана стройная сістэма абаронных арганізацый. Партыйная і савецкая прэса заходніх абласцей, як і ўвесь савецкі друк, павінна была дапамагчы партыйным камітэтам у справе выхавання працоўных сапраўднымі патрыётамі Радзімы, гатовымі стаць на абарону яе суверэнітэту.

Станоўчым прыкладам арганізацыі работы партыйна-савецкай прэсы Заходняй Беларусі па ваенна-патрыятычнаму выхаванню працоўных у 1939—1941 гадах з'яўляецца вопыт газеты «Вольная праца»—органа Беластоцкага абкома, гаркома КП(б)Б і аблвыканкома (у 1939 годзе—«Освобожденный Белосток»). Рад прычын, сярод якіх стратэгічнае становішча вобласці, блізкасць дзяржаўнай граніцы, укамплектаванасць рэдакцыі творчымі кадрамі, якія мелі вопыт работы з масамі, а таксама ўзмацненне з дапамогай Савецкай Беларусі матэрыяльна-тэхнічнай базы, дазволілі газеце стаць адным з вядучых выданняў у сістэме друкаванай прапаганды на тэрыторыі заходняга рэгіёна рэспублікі. Выступаючы асноўным сродкам палітыка-масавай работы абласной партыйнай арганізацыі, газета з'яўлялася сапраўдным прапагандыстам, агітатарам і арганізатарам мас.

У сваёй рабоце газета выкарыстоўвала шматлікія формы і метады, звя-

заныя з паляпшэннем ваенна-патрыятычнага выхавання, абаронна-масавай работы сярод насельніцтва. Прымяняліся розныя прыёмы журналісцкай творчасці па ўзмацненню прапагандысцкага ўплыву матэрыялаў. Асноўнымі тэмамі «Вольнай працы» былі знешняя палітыка дзяржавы, паказ рэвалюцыйных і баявых традыцый савецкага народа, яго барацьбы за ўмацаванне абараназдольнасці краіны, работа масавых арганізацый, выкрыццё рэакцыйнага характару развязанай вайны, міжнародныя падзеі.

Матэрыялы, прысвечаныя ленінскай міралюбівай знешняй палітыцы, публікаваліся літаральна ў кожным нумары газеты. Так, «Вольная праца» ў перадавым артыкуле пісала: «Калі ў капіталістычных краінах Еўропы працоўныя па волі імперыялістычных драпежнікаў уцягнуты ў гарніла крывапралітнай вайны, у гэты час у краіне сацыялізма ўсе народы, дзякуючы мудрай палітыцы нашага Савецкага ўрада, пажынаюць багатыя плады сваёй мірнай сацыялістычнай працы. За гэтае шчасце, за наша працоўнае сёння і яшчэ прыгажэйшае заўтра мы павінны аддаць усе свае сілы на далейшае ўмацаванне гаспадарчай і ваеннай магутнасці нашай радзімы [4]. Газета падкрэслівала, што Савецкі Саюз стаіць на пазіцыях мірнага суіснавання з усімі краінамі, незалежна ад іх сацыяльна-палітычнага ладу, прапагандавала мір паміж народамі, недапушчэнне кровапралітных войнаў.

Асаблівую актуальнасць набывалі матэрыялы, прысвечаныя рэвалюцыйным і баявым традыцыям рабочага класа Савецкага Саюза і яго Чырвонай Арміі. З успамінамі выступалі заходнебеларускія працоўныя, былыя ўдзельнікі рэвалюцыйных баёў, якія жорстка праследаваліся ў панскай Польшчы. У газеце паяўляюцца тэматычныя старонкі, прысвечаныя рускім і савецкім военачальнікам: А. В. Сувораву, М. В. Фрунзе і інш.; рэвалюцыйнаму мінуламу працоўных заходніх абласцей, напрыклад, удзелу беластоцкіх чыгуначнікаў ва ўсеагульнай забастоўцы 1905 года, сусветна-гістарычнаму значэнню Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і іншыя.

Упершыню ў 1940 годзе моладзь заходніх абласцей Беларусі ўступіла ў рады доблеснай Чырвонай Арміі, якая вызваліла Заходнюю Беларусь ад панскага прыгнёту. Маладыя людзі — беларусы, палякі, яўрэі — узялі зброю, каб абараняць сваю агульную Радзіму — Савецкі Саюз. У Беластоку адбыўся агульнагарадскі з'езд дапрызыўнікаў. 11 студзеня 1941 года «Вольная праца» змясціла зварот удзельнікаў з'езду: «Мы звяртаемся да ўсіх дапрызыўнікоў, камсамольскіх арганізацый, абаронных таварыств з заклікам шырока разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва паміж прадпрыемствамі, установамі, калгасамі, вышэйшымі навучальнымі ўстановамі на лепшую падрыхтоўку і правядзенне прызыву і выклікаем на спаборніцтва прызыўнікоў горада Брэста»[5].

Неабходна адзначыць, што сацыялістычнае спаборніцтва з'яўлялася магутным фактарам у барацьбе за ўмацаванне абароннай магутнасці краіны. Пытанням сацыялістычнага спаборніцтва на ўсіх участках вытворчасці, умацаванню працоўнай дысцыпліны прысвячалі свае матэрыялы журналісты, шматлікая армія пазаштатнага актыву.

Шырока асвятлялася работа масавых абаронных арганізацый. У артыкулах, карэспандэнцыях, замалёўках, заметках адлюстроўвалася работа па падрыхтоўцы значкістаў, спартсменаў-разраднікаў і г. д. З матэрыяламі выступалі партыйныя і савецкія работнікі абаронных арганізацый, ваенкаматаў, журналісты. Так, «Вольная праца» 18 студзеня 1941 года змясціла артыкулы В. Аксёнава «Вялікі лыжны дзень», А. Васільева «Выдатныя сувязісты», «Тыдзень абаронных фільмаў». Загадчык ваеннага аддзела Ваўкавыскага райкома партыі выступіў з артыкулам «Камуністы і камсамольцы павінны быць застрэльшчыкамі ў абароннай рабоце». Пад рубрыкамі «Жыццё Чырвонай Арміі», «Людзі Чырвонай Арміі» газета змяшчала такія матэрыялы, як «Насустрач XXIII гадавіне Чырвонай Арміі», «Чытачы чырвонаармейскай бібліятэкі», «Ваенная вучоба партыйнага актыва».

Газета шырока знаёміла чытачоў з характэрнымі асаблівасцямі вядзення сучаснай вайны. Прыкладам могуць служыць выступленні падпалкоўніка П. Вядзенічава «Абарона насельніцтва ад паветраных бамбардзіровак (па вопыту вайны ў Еўропе)», генерал-маёра А. А. Тарасава «Значэнне лыж у ваеннай справе», апублікаваныя ў «Вольнай працы»[6].

Важнае месца на старонках газеты займала тэма выкрыцця антынароднага, рэакцыйнага характару другой сусветнай вайны. Рэгулярна публікаваліся міжнародныя агляды, тэлеграмы з-за рубяжа. У падборках, прысве-

чаных міжнародным падзеям, можна было прачытаць аб вайне ў басейне Міжземнага мора і Афрыкі, аб англа-германскай, італа-грэчаскай вайне, аб заходнееўрапейскіх ваенных дзеяннях, аб харчовых цяжкасцях у Еўропе і г. д. Паказальнай у гэтым сэнсе была тэматычная старонка, змешчаная ў «Вольнай працы» 14 студзеня 1941 года.

Чацвёртая старонка была прысвечана міжнародным падзеям, у прыватнасці, аналізу водгукаў зарубежнага друку на заключэнне пагадненняў паміж Савецкім Саюзам і Германіяй. Так, у адным з артыкулаў гаварылася, што германскія газеты публікавалі тэксты гэтых пагадненняў пад вялікімі загалоўкамі і на самым відным месцы. Газета «Фёлькішэр беобахтэр», падкрэслівалася ў артыкуле, адзначае, што заключаныя пагадненні з'яўляюцца рэзультатам яснага разумення і ўліку ўзаемных інтарэсаў абодвух дзяржаў. Газета «Берлінер берзенцайтунг» у перадавым артыкуле дала падрабязны агляд развіцця савецка-германскіх адносін за апошні час. Газета «Дойчэ альгемайне цайтунг» падкрэслівала, што далейшае развіццё германа-савецкага тавараабароту пойдзе «на дабро абодвух партнёраў, якія роўным чынам будуць мець з гэтага пагаднення карысць»[7]. У другім артыкуле адзначалася, што англійскім друкам паведамленні аб новых савецка-германскіх пагадненнях былі апублікаваны без каментарыяў. Італьянскі друк удзяліў вялікую ўвагу заключаным 10 студзеня 1941 года ў Маскве пагадненням паміж СССР і Германіяй. Агенцтва «Юнайтэд Прэс» (ЗША) апублікавала тэкст перадавога артыкула газеты «Известия». Газета «Нью-Йорк таймс» змясціла ўказаныя пагадненні пад тэндэнцыйнымі загалоўкамі, якія сведчылі аб яўным незадавальненні той абставінай, што Савецкі Саюз заключае дагаворы і пагадненні з іншымі краінамі па свайму ўласнаму жаданню. Шведскія газеты «Данге нюхетэр» і «Афтанбладэт» пісалі, што ў Берліне надаюць выключнае значэнне новым пагадненням з СССР.

Газета знаёміла сваіх чытачоў з ваеннымі дзеяннямі фашысцкай Германіі. У артыкулах «Германскі друк аб ходзе ваенных дзеянняў», «Агенцтва Рэйтэр аб ваенных аперацыях на Заходнім фронце», «Паведамленні Ньюс-кронікл» і іншых на фактах і прыкладах паказвалася, што вайна, якую развязалі правячыя класы капіталістычных краін, несправядлівая і вядзецца за перадзел свету.

Шмат увагі газета ўдзяляла жыццю і барацьбе працоўных у Польшчы, пагаршэнню матэрыяльнага становішча рабочага класа і працоўнага сялянства ў капіталістычных краінах, зніжэнню іх жыццёвага ўзроўню, росту беспрацоўя і г. д.

Такім чынам, партыйна-савецкая прэса заходніх абласцей актыўна ўдзельнічала ў ідэйна-выхаваўчым працэсе, які праводзіўся партыйнымі камітэтамі ў масах. Метадалогія друкаванай прапаганды была неадрыўная ад узаемасувязі тэарэтычнай, палітычнай, агітацыйна-прапагандысцкай і арганізатарскай дзейнасці Камуністычнай партыі. Уплываючы на свядомасць, уздзейнічаючы на розум, пачуцці чытачоў, журналісты дабіваліся пэўных паводзін людзей, якія адпавядалі інтарэсам дасягнення сацыяльных задач і ідэалаў. Матэрыялы, апублікаваныя ў перыядычным друку, аказвалі дзейсны ўплыў на фарміраванне ў працоўных заходніх абласцей Беларусі гатоўнасці абараняць сацыялістычную Айчыну, спрыялі згуртаванасці і арганізаванасці іх напярэдадні цяжкіх выпрабаванняў.

[1] Материалы XXVII съезда КПСС. Мінск, 1986. С. 78.
[2] Сборник законов БССР и указов Президиума Верховного Совета БССР за 1938—1955 гг. Мінск, 1956. С. 40—41.
[3] ПА ИИП при ЦК КПБ. Ф. 4, оп. 3, д. 1200, л. 65.
[4] Вольная праца. 1941. 1 студзеня.
[5] Там жа. 11 студзеня.
[6] Там жа. 26 сакавіка.
[7] Там жа. 14 студзеня.

О. Т. МАНАЕВ

## РОЛЬ РАЙОННОЙ ГАЗЕТЫ В РАЗВИТИИ ОБЩЕСТВЕННОГО МНЕНИЯ

В условиях ускорения социально-экономического развития страны, перестройки политического мышления его основных субъектов все более возрастает значение общественного мнения. Общественное мнение (ОМ)